Идея формирования правового государства в Республике Беларусь провозглашена в Декларации о государственном суверенитете, принятой Верховным Советом 27 июля 1990 года. На законодательном уровне эта идея была впервые закреплена в Конституции Республики Беларусь 1994 года. Приняты законы *«О гражданстве», «О всенародном голосовании (референдуме)», «О коллективных договорах и соглашениях», «О правах ребенка», «О свободе совести и религиозных организациях», «О национальных меньшинствах»* и др. Законодательная работа в этом направлении в белорусском парламенте постоянно продолжается.

5. ***Духовные условия.*** Начало 90-х годов прошлого столетия характеризуется серьезными изменениями в системе духовного воспитания, способствующей гражданскому развитию личности. В Республике Беларусь деятельность в сфере образования регулируется целым комплексом законов. Основным является Закон ***«Об образовании».*** Согласно этому закону, гражданам Республики Беларусь гарантируется право на получение бесплатного общего среднего, профессионально-технического и на конкурсной основе – бесплатного среднего специального и высшего образования.

Одним из важнейших изменений в системе белорусского образования стало появление частных учебных заведений. В Законе **«Об образовании»** предусмотрено регулирование образования, осуществляемого негосударственными учебными заведениями. Негосударственные учебные заведения могут осуществлять образование любого типа, но обязаны придерживаться стандартов Министерства образования. Государство имеет право контроля за деятельностью негосударственных учебных заведений в сфере образования. И все же необходимо внести существенные изменения в белорусское законодательство, позволяющие национальным субъектам образования принимать активное участие в «болонском процессе».

Особое место в системе формирования гражданского общества играет ***культура.*** Деятельность в сфере белорусской культуры регулируется целым рядом законов: ***«О культуре в Республике Беларусь»; «О музеях и музейном фонде Республики Беларусь»; «О библиотечном деле»*** и других. Эти законы создают реальную возможность всем жителям пользоваться достижениями национальной культуры, формироваться развитыми личностями, создают духовные предпосылки формирования гражданского общества.

Особое значение для развития белорусской науки, приостановления утечки лучших умов за границу имеет Закон Республики Беларусь ***«О государственной поддержке и государственных гарантиях инновационной деятельности в Республике Беларусь»,*** разработанный профессором И. В. Котляровым. В случае принятия данного закона субъекты инновационной деятельности – талантливые ученые и инженеры смогут получать 1–1,5 тысячи долларов в месяц за свои научные изыскания дома и не поедут «за длинным рублем» за границу. Данный закон поможет создать совершенно новую ситуацию в белорусской науке, поможет формированию принципиально новой плеяде белорусских ученых, которые будут эффективно работать на белорусское государство. К сожалению, этот законопроект до сих пор не принят.

Формирование гражданского общества в Республике Беларусь реально и возможно. Но этот важный процесс требует огромных усилий как со стороны государства, так и общественных структур, как со стороны государственных чиновников, так и непрофессиональных политиков.

© ПГУ

## ІДЭЯ ВЕРАЦЯРПІМАСЦІ Ў РЭЛІГІЙНАЙ ПАЛІТЫЦЫ ВКЛ

***В. У. ЧАРАЎКО*, В. І. ШАЙКОЎ**

The Article is dedicated to development to ideas tolerances in Great Lithuanian Duchy in 13 – 16 ages. The evolution of the presentations is Analysed about tolerances

Ключевые слова: паганства, праваслаўе, каталіцтва, верацярпімасць, талерантнасць

У рэлігійнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага выключнае месца займае ідэя верацярпімасці (талерантнасці). С. А. Падокшын вызначае яе ў якасці курса дзяржаўнай канфесійнай палітыкі, альтэрнатыўнага і роўнага па значнасці уніяцкаму [1, с. 37–39]. У розныя перыяды гісторыі талерантнасць у ВКЛ разумелася па-рознаму. Паспрабуем прасачыць эвалюцыю ідэі верацярпімасці.

Вялікае княства Літоўскае паўстала ў сярэдзіне XIII ст. [2, с. 190–192]. Яго насельніцтва тады спавядала або паганства, або праваслаўе [2, с. 391]. Узаемаадносіны язычнікаў і хрысціян у ім насілі мірны характар [2, с. 391]. Тлумачыцца гэта, па-першае, адметнасцямі менталітэту паганца (які «талерантны, – не з прызнання за іншым права мець уласную суб'ектыўную ісціну, а з прынцыповай згоды з іншым у аб'ектыўнай праўдзівасці яго боства»), па-другое, тым, што тагачаснаму праваслаўю, асабліва на мяжы з язычніцтвам, былі ўласцівы некаторыя, мякка кажучы, не зусім кананічныя ўяўленні [3, с. 146, 240–241]. Міндоўг – першы правіцель ВКЛ – дэманстраваў у

вышэйшай ступені прагматычнае стаўленне да пытанняў веравызнання і мяняць рэлігію падданых не прымушаў [2, с. 391, 393].

Верацярпімасць Міндоўга шмат у чым была вымушанай, лавіруючай. Пры Гедыміне талерантнасць узводзіцца ў статус дзяржаўнай палітыкі і пашыраецца не толькі на язычнікаў і праваслаўных, але і на католікаў (гаспадар запрашаў у ВКЛ асоб каталіцкага веравызнання: «рыцараў, зброяносцаў, купцоў, лекараў, кавалёў... прадстаўнікоў любога віду рамяства», а таксама дамініканцаў і францысканцаў) [4, с. 153; 5]. Словы, сказаныя вялікім князем папскім паслам: «Свой бог ёсць у русінаў, свой у палякаў, немцаў, так і ў нас [язычнікаў]; няхай кожны моліцца свайму богу» – можна лічыць дэвізам своеасаблівай «паганскай талерантнасці» [6, с. 242; 7, с. 70]. Пэўныя зрухі ў рэлігійнай палітыцы адбыліся пры Альгердзе, які з талерантнасцю не парываў, але больш актыўна садзейнічаў хрысціянізацыі [4, с. 76; 8, с. 86–88].

Наступныя вялікія князі адыходзяць ад верацярпімасці. У 1387 г. Ягайла надае вялікія прывілеі выключна каталіцкай знаці і пачынае маштабны перавод у заходнехрысціянскую веру язычнікаў [4, с. 83; 9, с. 64, 67]. З заключэннем Гарадзельскай уніі ў 1413 г. займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады маглі «толькі католікі і Рымскай царквы падданыя» [4, с. 83; 9, с. 68–70]. Сітуацыя змянілася толькі ў 1434 г., калі Жыгімонт Кейстутавіч Троцкім прывілеем пашырыў правы, гарантаваныя католікам, на праваслаўных [4, с. 98; 9, с. 71]. Прывілей Казіміра 1447 г. дараваў феадалам як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання роўныя правы [4, с. 102].

У гэтым выявілася новае разуменне верацярпімасці вярхоўнай уладай. Роўнасць прадстаўнікоў праваслаўнай і каталіцкай знаці прызнавалася ў сілу прыналежнасці і тых, і другіх да хрысціянства (аб чым узгадалі дзякуючы Фларэнтыйскай уніі) [10, с. 267]. Талерантнасць у ВКЛ пасля 1447 г. можна назваць біканфесійна-парытэтнай – яна вынікала з прызнання роўнымі дзьвюх асноўных хрысціянскіх плыняў [7, с. 71].

З’яўленне ў ВКЛ пратэстантызму прывяло да новага разумення талерантнасці. Згодна з прывілеем Жыгімонта Аўгуста 1563 г. прадстаўнікі «стану рыцарскага і шляхецкага» «веры хрысціянскай» – усе феадалы-хрысціяне – былі абвешчаны роўнымі [9, с. 79–81]. Адсутнасць варожасці паміж прадстаўнікамі феадальнай эліты ў ВКЛ моцна здзіўляла іншаземцаў (Фёдар Еўлашоўскі апісвае адзін такі выпадак, калі яго – пратэстанта – запрасіў на абед віленскі канонік) [11, с. 484].

Нормы верацярпімасці былі ўключаны ў Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., дзе адзначалася: «... абяцаем..., што мы, якія з’яўляемся рознымі ў веры, мір паміж сабою захоўваць, а ў сувязі з розніцай веры... крыві не праліваць і не караць..., і ніякаму вяршэнству, ані ўраду, да такога ўчынка ніякім чынам не дапамагаць...» [12, с. 43].

З заключэннем Брэсцкай уніі 1596 г. адбываецца паступовы адыход ад верацярпімасці. Хаця пры абранні вялікія князі абяцалі падтрымліваць у краіне рэлігійны мір, гэтае патрабаванне набывае пераважна фармальны характар, да таго ж ва ўмовах аслаблення цэнтральнай улады заканадаўчыя нормы не заўсёды выконваліся [13, с. 525].

Такім чынам, у сярэдзіне XIII – XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім верацярпімасць у рэлігійнай палітыцы адыгрывала значную ролю. Ідэя верацярпімасці за гэты перыяд эвалюцыянавала ад звычаёвых нормаў «паганскай талерантнасці» да поліканфесійнай талерантнасці, замацаванай заканадаўча.

**Літаратура**


1. *Падокшын С.А.* Унія. Дзяржаўнасць. Культура. (Філасофска-гістарычны аналіз). – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2000. – 111 с.
2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1: Са старажытных часоў да кан. XVIII ст.: Курс лекцый/ І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
3. *Карташев А.* Собрание сочинений: В 2 т. Т. 1.: Очерки по истории русской церкви. – М.: ТЕРРА, 1992. – 686 с.
4. *Сагановіч Г.* Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да кан. XVIII ст. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.: іл.
5. Послания Гедимина// http://www.vostlit.info/.
6. *Kostan M.* Reformacja w panstwie Jagiełłonów: ochekiwania i rzechywistość// Наш радавод: Материалы междунар. науч. конф. по региональной истории Вост. Европы “Культура народов ВКЛ и Белоруссии: XIII – нач. XX в.” Кн. 3. Ч. II. – Гродна, 1991 – С. 238 – 246.
7. *Чараўко В.У.* Уніяцтва на Беларусі: выпадковасць, заканамернасць, альтэрнатыва?// Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета/ Гуманитарные науки. Вып. 6. – Новополоцк, 2004. – С. 70 – 71.
8. *Батюшков П.Н.* Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2004. – 407 с.; ил.
9. Уния в документах: Сб./ Сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Мн.: Лучи Софии, 1997. – 520 с.; ил.
10. *Ермаловіч М.І.* Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – 2-е выд. – Мн.: Беллітфонд, 2003. – 448 с.; іл.
11. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: IX – першая палова XVIII ст./ НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; Падрыхт. А.І. Богдан і інш. Навуковы рэдактар В.А. Чамярыцкі. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 1015 с.
12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. – Мн.: Беларусь, 2002. – 207 с.; іл.

13. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1: Абаленскі - Кадэнцыя/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 2005. – 668 с.; іл.

© БГМУ

# МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 20-30 ГАДОЎ XX ст.

***А. П. ЕФИМОВА*, Т. С. ТАРАСЕВИЧ**

Cultural development of contemporary Byelorussian in the first turn depends on general knowledge of cultural life of Byelorussia. Considerable achievement of this period is fine arts as the brightest phenomenon of Byelorussian culture. Scientific work is based on complex study of literature and archives of Byelorussian national culture. P. Sergievich, M. Sevruk, Yazep Drazdovich, Yazep Gorida started their creative life as artists in the Western Byelorussia. Their works represent a difficult life of Byelorussian people and show the beauty of everyday life

Ключавыя словы: культура Беларусі, жывапіс

Аналіз развіцця нацыянальнай культуры Беларусі 20-30-х гадоў XX ст. паказвае, што культурнае жыццё праходзіла ў даволі складаных абставінах, развівалася ў кантэксце існуючых сацыяльна-палітычных умоў. Гістарычна склалася такім чынам, што на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў адзначаны час існаваў сімбіёз трох культур: рускай, беларускай і польскай. Але, нягледзячы на гэта, як паказваюць факты, нацыянальная культура Беларусі захавала пэўную адметнасць. Ва ўмовах паланізацыйна-асіміляцыйнай палітыкі ўлады нацыянальная культура ў Заходняй Беларусі адыгрывала асабліва важную ролю. Спыніць развіццё нацыянальнай культуры адзначаныя перашкоды не змаглі.

Жывапіс Заходняй Беларусі – адметная і неад’емная частка гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва. Аналіз развіцця выяўленчага мастацтва паказвае, што прадстаўнікі ўсіх яго жанраў плённа працавалі. Ад невялікіх пейзажаў і партрэтаў яны пераходзілі да значных тэм. У межах свайго вопыту і майстэрства мастакі імкнуліся паказаць багатыя культурныя традыцыі народа, гісторыю Бацькаўшчыны, самабытнасць беларускай культуры, помнікі мінулага. У мастацкай адукацыі вялікая роля належыць Віленскаму універсітэту і беларускім гімназіям, з якіх выходзілі таленавітыя жывапісцы.

Сваім патрыятычным пафасам, нацыянальным каларытам вызначаліся П. А. Сергіевіч, М. К. Сеўрук, Я. Н. Драздовіч, Я. М. Горыда і інш. Іх творы ўвайшлі ў залаты фонд беларускага выяўленчага мастацтва, а плённая праца ў галіне мастацкай адукацыі не магла не пакінуць свайго адбітку ў далейшым развіцці заходнебеларускага жывапісу.

Сярод мастакоў Заходняй Беларусі асоба Пятра Аляксандравіча Сергіевіча бадай што самая прыкметная. У яго творчасці ярка адбіліся рысы, характэрныя для мастацтва таго часу. У цэнтры яго палотнаў – вобраз чалавека, якім ён ёсць і якім ён павінен быць. Выразны па сацыяльнаму гучанню твор «Шляхам жыцця» (1934) вядомы і пад другой назвай – «Падарожныя». Эмацыянальная, вобразная па пластычнаму і кампазіцыйнаму рашэнню карціна. З рэдкай праўдзівасцю паказвае ў ёй Сергіевіч пакуты і тагачасны стан беззямельнага селяніна, даведзенага да адчаю польскімі абшарнікамаі. Тэма разняволення, гераізму праходзіць праз усю творчасць Сергіевіча.

У кнізе водгукаў вядомы паэт Ніл Гілевіч запісаў такія словы: «Больш паўвека працуе ў мастацтве Пётра Аляксандравіч. Ва ўсім, што ён зрабіў: у карцінах на гістарычныя тэмы (а тут ён, можна сказаць, пачынальнік), асабліва ў партрэтах людзей, з якімі ён пражыў жыццё, ва ўсім выяўляецца вернасць свайму народу. З жыцця народа, з роднай зямлі ўвесь час чэрпае ён сокі і фарбы сваёй творчасці.» [1, с.301].

Майстра рэалістычнага напрамку Міхась Сеўрук вылучаўся дасканалымі партрэтамі, якія вельмі трапна перадавалі характар, псіхалагічны стан людзей. У 1937г. Сеўрук стварае адзін з самых значных сваіх твораў, які з’явіўся своеасаблівым гімнам чалавеку зямлі – шматфігурная кампазіцыя «Жніво». Яна экспанавалася на выставах у Варшаве і Брэсце, потым была набыта Віленскім беларускім музеем, цяпер захоўваецца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі [2, с. 170].

Мастацкая культура Заходняй Беларусі спрыяла росту чалавека ў яго агульнаадукацыйным і культурным узроўні. Факты сведчаць аб тым, што менавіта ў Заходняй Беларусі ажыццяўлялася сапраўдная культурная рэвалюцыя, якая не магла не пакінуць свайго адбітку ў агульнанацыянальным і культурным працэсе 20–30-х гадоў XX ст.

**Литература**

1. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6т. / Акад. Навук Беларусі. Ін-т мастацтвазн. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984-1994. – Т.4: 1917–1941гг. / Рэд. *Л. М. Дробаў, В. Ф. Шматаў*. – 1990. – 352с., іл.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ) ф.1. воп.1. спр.595.